

КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

№3(119)

1 лютага 2014 Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь

ВЫДАВЕЦ “КЛІМАВІЦКАЙ ІНФА-ПАНАРАМЫ” НЕ ЗГОДНЫ З АДКАЗАМ РАЙВЫКАНКАМА

Сяргей Аржанцаў, выдавец маланакладнага грамадска-палітычнага бюлетэня “Клімавіцкая Інфа-Панарама”, 24 студзеня азнаёміўся з адказам на сваю скаргу ў кнізе заўваг і прапаноў Клімавіцкага райвыканкама.









Для гэтага грамадскаму актывісту і сябру ГА “БАЖ” (Беларуская асацыяцыя журналістаў) давялося самому наведаць аддзел па зваротах грамадзян Клімавіцкага райвыканкама. На яго пытанне, чаму ён да гэтага часу не атрымаў афіцыйнага адказу, чыноўнікі з аддзела сказалі, што даслалі яму ліст яшчэ 17 студзеня.

Нагадаем, што 8 студзеня Сяргею Аржанцаву адмовілі ў праве прысутнічаць на пасяджэнні адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама. У гэты дзень камісія павінна была разглядаць некалькі спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, якія зацікавілі выдаўца “Клімавіцкай Інфа-Панарамы”. Прысутнасць грамадскага актывіста чамусьці не спадабалася старшыні адміністрацыйнай камісіі Наталлі Асмалоўскай. Спадарыня Асмалоўская, якая, акрамя старшынства ў камісіі, адначасова ўзначальвае ўпраўленне справамі Клімавіцкага райвыканкама, паведаміла Сяргею Аржанцаву, што яна забараняе яму прысутнічаць на пасяджэнні.

У той жа дзень Сяргей Аржанцаў пакінуў адпаведны запіс у кнізе заўваг і прапаноў Клімавіцкага райвыканкама. Ён напісаў, што старшыня адміністрацыйнай камісіі Наталля Асмалоўская не дазволіла яму прысутнічаць на пасяджэнні камісіі без тлумачэння прычын. Аржанцаў выказаў жаданне атрымаць афіцыйны адказ — чаму былі парушаны яго грамадзянскія правы.


У адказе ад 17 студзеня за подпісам намесніка старшыні Клімавіцкага райвыканкама А.А. Ломанава Сяргею Аржанцаву паведамілі: “У сувязі з тым, што Вы не з'яўляліся ўдзельнікам адміністрацыйнага працэса, абараняючым свае альбо прадстаўляемые правы і інтарэсы другіх асобаў, а таксама іншым удзельнікам працэса ў адпаведнасці з главой 4 Працэсуальна-выканаўчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, старшыня адміністрацыйнай камісіі палічыў магчымасць удзелу Вас у адміністрацыйным працэсе па прызначаных для разгляду справах беспадстаўнай”. Акрамя гэтага, дадае спадар Ломанаў, ніхто з ўдзельнікаў адміністрацыйнага працэса не заявіў хадайніцтва аб неабходнасці Вашай прысутнасці на пасяджэнні.

У выніку намеснік старшыні райвыканкама А.А. Ломанаў прыходзіць да высновы: “Такім чынам, пры адмове ў задавальненні ўказаных патрабаванняў Вашы правы і законныя інтарэсы не парушаны, значыць, аднаўляць іх на законнай падставе не прадстаўляецца магчымым”.

Сяргей Аржанцаў не пагадзіўся з адказам клімавіцкіх чыноўнікаў: “Калі пагадзіцца з такім адказам, то мне застаецца толькі прызнаць, што я сапраўды не меў права прысутнічаць на пасяджэнні адміністрацыйнай камісіі райвыканкама. Да таго ж, фактычна гэта азначае, што ўжо і ў будучым уваход туды мне зачынены “на законнай падставе”. Але Працэсуальна-выканаўчы кодэкс РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях дэкларуе: “Справа аб адміністрацыйным правапарушэнні разглядаецца адкрыта” (артыкул 2.14). Няма ніякіх згадак пра неабходнасць быць удзельнікам адміністрацыйнага працэса, хадайніцтва і г. д. Таму я не магу пагадзіцца з правамернасцю дзеянняў чыноўнікаў, якія парушылі мае правы як грамадзяніна і прадстаўніка журналісцкай супольнасці Беларусі”.

Выдавец незалежнага выдання будзе абскарджваць адказ клімавіцкіх чыноўнікаў у Магілёўскім аблвыканкаме.

**** Служба маніторынгу ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў"***



ПАШЫРЭННЕ ПЛАТНЫХ МЕДЫЧНЫХ ПАСЛУГ СТВОРЫЦЬ ЧЭРГІ НА БЯСПЛАТНЫЯ

Віталь ЦЫГАНКОЎ, Радыё Свабода

У Беларусі неабходна правесці глыбокую сістэмную аптымізацыю сістэмы аховы здароўя, — заявіў віцэ-прэм'ер Анатоль Тозік.

Існуе пагроза дэградацыі медычнай галіны, неабходна падымаць заробак медыкам, — заявіў таксама намеснік прэм'ер-міністра. Ці азначаюць гэтыя словы, што ўсё больш медычных паслуг для насельніцтва будуць платнымі? Ці гатовыя ўлады Беларусі пайсці на рэформу сістэмы аховы здароўя? На гэтыя пытанні адказвае эканаміст Міхал Залескі.

Цыганкоў: Ці можна з выказванняў Тозіка зрабіць выснову, што ўрад рыхтуе грамадства да таго, што звычайным беларусам давядзецца ўсё больш плаціць за медычныя паслугі?

Залескі: Урад не разумее адной рэчы — што такое рынак. Рынак — гэта ў першую чаргу не аплата, а канкурэнцыя. Савецкая медыцына, якая дзейнічае і зараз у нас, выключыла канкурэнцыю паміж дактарамі. Трэба яе вярнуць. А грошы могуць быць і дзяржаўныя — галоўнае наяўнасць канкурэнцыі.

Цыганкоў: Вы маеце на ўвазе тую сістэму, калі пацыент сам выбірае сабе медыка, сам яму плаціць праз страхавую медыцыну — у выніку больш паспяховыя, больш прафесійныя медыкі лепш зарабляюць?

Залескі: Безумоўна. Другая праблема — у нас медыцына вельмі капіталаёмістая. Будуюцца велізарныя шпіталі, стацыянарныя структуры, «койка-месцы». На Захадзе даўно арыентацыя ідзе на мабільныя структуры. Не койка-месца лечыць чалавека, а кантакт з доктарам.

Цыганкоў: Якраз па койка-месцах на душу насельніцтва Беларусь займае адно з першых месцаў у свеце...

Залескі: Так. І мы іх трымаем, ацяпляем, плацім амартызацыю. На людзей не застаецца. Калі ж доктар будзе вырашаць сам, то ён сам будзе зыходзіць з таго, колькі яму патрэбна памочнікаў і з якой кваліфікацыяй.

У нас існуе добрая інфраструктура. І яе трэба засвойваць, падвышаць ад яе аддачу. Іначай будзе тое самае, што з аграгарадкамі.



Цыганкоў: Ці азначаюць словы Тозіка, што ўсё больш медычных паслуг для насельніцтва будуць платнымі?

Залескі: Пашырэнне платы за медычныя паслугі створыць чэргі на бясплатныя паслугі. Гэта ўжо праходзіла Польшча. На бясплатную будуць запісвацца ўсе пенсіянеры, каб хоць нешта адхапіць.

У выніку парушыцца савецкая сістэма маніторынгу. Пакуль наш узровень аховы здароўя трымаецца на гэтай сістэме. Але яно ўсё пачне развальвацца.

В БЕЛАРУСИ РАСТЁТ КОЛИЧЕСТВО ИНВАЛИДОВ

В 2012 году в Беларуси впервые признаны инвалидами 60,6 тыс. человек, что на 9,1% больше, чем в 2005 году. Такие данные приводит Национальный статистический комитет в своем ежегодном обзоре, передаёт БелаПАН.

Среди взрослого населения в прошлом году впервые были признаны инвалидами 57,5 тыс. человек. Чаще всего к инвалидности взрослых приводят болезни системы кровообращения — 44,1% случаев, новообразования — 21,7%, болезни костно-мышечной системы и соединительной ткани — 8%.

В 2012 году впервые были признаны инвалидами 3.091 детей в возрасте до 18 лет. Уровень первичной инвалидизации составил 17,8 человек на 10 тысяч человек.

Причинами детской инвалидности чаще всего становятся врожденные аномалии, деформации и хромосомные нарушения — 29,1% случаев, болезни нервной системы — 19%, психические расстройства и расстройства поведения — 11,1%.

МИНИСТР ПРИЗНАЛ ПРОБЛЕМЫ ЗДРАВООХРАНЕНИЯ

Как сообщает interfax.by, министр здравоохранения РБ Василий Жарко заявил, что врачи уезжают за пределы страны: «Существует проблема оттока квалифицированных кадров из отрасли. Мы знаем, что приграничные регионы России строят свою политику на том, чтобы приглашать на работу наших высококвалифицированных врачей».

«Нам нужно переломить эту ситуацию», — подчеркнул министр. При этом он отметил, что проблему трудовой миграции белорусских медиков «можно решить двумя способами — увеличением заработной платы и решением жилищной проблемы».



Он также обратил внимание на то, что «появилась проблема снижения престижа медработника, в первую очередь — специалиста среднего звена». «Во всех без исключения медколледжах отмечается снижение уровня подготовки, снижается престиж среднего медперсонала», — сказал В.Жарко, добавив, что «в результате произошёл недобор в средние медицинские учебные заведения».



ЖЫХАРКА КЛІМАВІЦКАГА РАЁНА ПРОСІЦЬ ПАКАРАЦЬ УЧАСТКОВАГА МІЛІЦЫЯНЕРА ЗА ПАКЛЁП

Аб гэтым сведчыць наступны матэрыял, якая з'явіўся на сайце spring96.org:

"Жыхарка вёскі Дамамерычы Клімавіцкага раёна Алена Марчанка 21 студзеня накіравала заявы на імя начальніка Клімавіцкага РАУС і ва Упраўленне ўнутраных спраў Магілёўскага аблвыканкама, у якіх просіць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці па артыкулу 9.2 КаАП (паклёп) участковага інспектара Клімавіцкага РАУС Панасенку В.С.



Таксама жанчына звяртаецца да міліцэйскіх кіраўнікоў з просьбай не прапусціць двухмесячны тэрмін для прыцягнення ўчасткова інспектара Панасенку да адміністрацыйнай адказнасці.

Нагодай для напісання заявы на імя начальніка Клімавіцкага РАУС паслужыла тое, што на паседжанні адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага раёна 8 студзеня 2014 года была публічна агалошаная напісаная ўчастковым інспектарам Клімавіцкага РАУС Панасенкам В.С. характарыстыка, якая ўтрымлівала, на думку Алены Марчанка, заведама ілжывыя і ганьбячыя яе звесткі. У прыватнасці, у шэрагу з іншым, у характарыстыцы ўчастковы інспектар піша, што Алена Марчанка "схільная да ілжы і паклёпу".

Сама Алена Марчанка не згодна з гэтым сцвярджэннем супрацоўніка міліцыі і ў якасці доказу прыводзіць той факт, што яна ні разу не прыцягвалася да адміністрацыйнай, грамадзянскай ці дысцыплінарнай адказнасці за распаўсюд ілжывай альбо паклёпніцкай інфармацыі.

Таксама спадарыня Марчанка спасылаецца на папярэднюю характарыстыку таго ж участковага Панасенкі, у якой ён характэрызуе яе як спакойнага, ураўнаважанага чалавека, які не ўчыняе скандалаў па месцы жыхарства, па месцы жыхарства характэрызуецца здавальняюча і да адміністрацыйнай адказнасці не прыцягвалася.

Процістаянне законапаслухмянай спадарыні Марчанкі з мясцовымі ўладамі пачалося пасля таго, як Алена Марчанка выступіла супраць знішчэння сваіх свіней у сувязі з небяспекай распаўсюджання афрыканскай чумы свіней.

Пастановай па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні ад 08.01.2014 года адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама спадарыня Марчэнка прыцягнутая да адміністрацыйнай адказнасці па ч.1 арт.15.38 КаАП у выглядзе папярэджання за парушэнне ветэрынарных і ветэрынарна-санітарных правіл.

Алена Марчанка не пагадзілася з вынесенай пастановай і падала скаргу ў суд Клімавіцкага раёна. Таксама спадарыня Марчанка падала скаргу на дзеянні службовых асобаў адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама на імя пракурора Клімавіцкага раёна. У скарзе яна звяртаецца з просьбай правесці праверку дзейнасці адміністрацыйнай камісіі Клімавіцкага райвыканкама ў сувязі з тым, што пры разглядзе яе адміністрацыйнай справы былі дапушчаны парушэнні заканадаўства".

ДЕМОГРАФИЧЕСКАЯ ПРОПАСТЬ УГЛУБЛЯЕТСЯ

Александр ВЛАД

В обозримой перспективе демографический вопрос станет самым актуальным для нашей страны. Актуальность обостряется тем, что с демографическим положением неразрывно связано развитие экономики. К тому же у нас высокая смертность сочетается с выездом населения в дальнее и ближнее зарубежье, что ещё больше ухудшает демографию. В силу этого сегодня уже общепризнано, что Беларусь имеет серьёзный дефицит трудовых ресурсов.

В свете вышесказанного Климовичский район выступает ярким примером, подтверждающим сделанные выводы. Демографическая ситуация в районе ухудшается с каждым годом, что негативно влияет на его социально-экономический потенциал. Об этом убедительно свидетельствуют статистические данные за последние несколько лет, всего лишь за один неполный президентский срок Лукашенко.

* ДЕМОГРАФИЧЕСКИЕ ПОКАЗАТЕЛИ РАЙОНА ЗА 2010–2013 гг.

ПОКАЗАТЕЛИ	на 1-е полугодие 2010 г.	на 1-е полугодие 2011 г.	на 1-е полугодие 2012 г.	на 1-е полугодие 2013 г.
Численность населения в районе	28109	27468	26904	26377
Численность населения, занятого в экономике района	12020	11731	11273	11069



ПАМЁР СТВАРАЛЬНІК ФОНДА "ДЗЕЦЯМ ЧАРНОБЫЛЯ"

Ясь ГАСПАДАР

28 студзеня ва ўросце 63 гадоў памёр вядомы грамадскі дзеяч і навуковец Генадзь Грушавы. Паведамляецца, што ён хварэў на лейкемію. Галоўнай справай жыцця Генадзя Грушавога стала стварэнне фонда «Дзецям Чарнобыля».

Да аварыі на Чарнобыльскай АЭС Генадзь Грушавы быў вядомы як выдатны выкладчык філасофіі. Прафесар, доктар філасофскіх навук, аўтар шэрагу публікацый. Чарнобыльская трагедыя змяніла яго лёс.

Амаль адразу пасля катастрофы на ЧАЭС ён пачаў займацца дапамогай людзям, якія жылі на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях. Гэта была ўласная ініцыятыва сумленнага чалавека. Грушавы шукаў сродкі, звяртаўся да сяброў і знаёмых, пісаў у газеты і на тэлебачанне. Ён тлумачыў, што кожны згублены дзень нясе смяротную бяду насельніцтву чарнобыльскіх раёнаў.

Разам з аднадумцамі Генадзь Грушавы стварае арганізацыю «Дзеці Чарнобыля». Дзяржава не спяшалася падтрымаць сваіх грамадзян, таму грамадскія актывісты вырашылі самастойна аказваць дапамогу тым, хто мае ў ёй патрэбу. Каб зменшыць рызыку захворвання, дзяцей пачалі вывозіць на аздараўленне за мяжу — у ЗША, Канаду, Італію, Германію. Толькі за першыя гады існавання арганізацыі дзясяткі тысяч маленькіх грамадзян Беларусі атрымалі неабходную медычную і гуманітарную дапамогу. Аб гэтым адкрыта паведамлялася ў дзяржаўных СМІ. Да прыкладу, вось якія звесткі друкаваліся ў тыя часы ў газеце Клімавіцкага раёна: "У гэтым навучальным годзе дзве паездкі было арганізавана фондам "Дзеці Чарнобыля", якім кіруе лідэр БНФ Генадзь Грушавы. 20 выдатнікаў вучобы пабывалі ў чэрвені ў Штутгарце і больш за 40 школьнікаў выехала ў другі горад Германіі".

Прыход да ўлады Аляксандра Лукашэнкі змяніў палітычную сітуацыю ў краіне, што паўплывала і на становішча фонда «Дзецям Чарнобыля». На Генадзя Грушавога сталі ціснуць за грамадскую дзейнасць, а дабрачыннай арганізацыяй заняліся кантралёры і міліцэйскія следчыя.

Да таго ж гэты мужны змагар з Чарнобылем сам захварэў ад радыяцыі. Хутчэй за ўсё хвароба стала вынікам шматлікіх паездак Генадзя Грушавога па чарнобыльскіх гарадах і вёсках.

У памяці не аднаго пакалення беларусаў ён назаўжды застанецца чалавекам, які да самой смерці змагаўся за жыццё іншых людзей.

БІЯГРАФІЧНАЯ ДАВЕДКА:

Генадзь Грушавы нарадзіўся ў Мінску 24 ліпеня 1950 года. Пасля школы паступіў на філасофскі факультэт БДУ. Абараніў кандыдацкую, а потым доктарскую дысертацыю па філасофіі. У гады нацыянальнага адраджэння быў адным з арганізатараў і актыўных удзельнікаў Беларускага народнага фронту. У 1990 годзе выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета 12 склікання, дзе ўваходзіў у фракцыю БНФ. Выбіраўся і ў парламент наступнага складу. У 1989 годзе Генадзь Грушавы стаў старшынёй Камітэта БНФ «Дзеці Чарнобыля», які потым ператварыўся ў фонд «Дзецям Чарнобыля». Усяго ў Беларусь па лініі фонда паступіла гуманітарнай дапамогі, пераважна лекаў, на суму каля 500 мільёнаў долараў. За гады дзейнасці фонда 160 тысяч дзяцей былі накіраваны на рэабілітацыю і аздараўленне ў многія краіны свету.

256 ОБЩЕСТВЕННЫХ ОБЪЕДИНЕНИЙ ЛИШИЛИСЬ ЛЬГОТ ПО АРЕНДЕ


В Беларуси около трёх тысяч общественных организаций. До недавнего времени существенные льготы по аренде помещений (90% скидка) были у 451 организации. В этом году список счастливчиков резко сократили. Перечень льготников составляется по согласованию с президентом. О тех, кому оставили льготы и кто их лишился, рассказывается в материале sn-plus.com.

В шорт-лист объединений, которым предоставили льготу, вошли практически все федерации спорта, включая даже... Федерацию гольфа. Из 195 организаций, оставшихся в списке льготников, 52 — именно спортивные федерации и объединения. Любопытно, что молодёжным объединениям спортивной тематики льготы предоставлены, а молодёжным организациям интеллектуальной и развлекательной направленности («Гомельский клуб весёлых и находчивых», «Белорусский КВН») — нет.

Льготы получили объединения инвалидов, благотворительные, «чернобыльские» организации, оказывающие помощь детям, объединения многодетных родителей.

В список общественных объединений, которым оказывается поддержка, не вошли ОО «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны» (ТБМ), ОО «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», ОО «Белорусский фонд SOS — Детская деревня», РОО «Центральная служба анонимных алкоголиков», БОО «Республика без наркотиков», РОО «Белорусская ассоциация клубов ЮНЕСКО», РОО «Лига добровольного труда молодежи». Почему это произошло, в Государственном комитете по имуществу не ответили, сославшись на «невозможность предоставить информацию». Из списков вылетели союзы предпринимателей и экологические объединения.

Льгот также лишились союзы национальных меньшинств, в том числе ОО «Союз поляков на Беларуси». Однако в счастливый список вошли еврейские благотворительные объединения и общины, а также Коммунистическая партия Беларуси.



МЫСЛИ О ЖИЗНИ ОТ ВИКТОРА ГЕРАЩЕНКО

Михаил ПЕТРОВ

В одном из прошлогодних номеров журнала Esquire опубликовали рассуждения известного финансиста и банкира Виктора Геращенко. В своей деятельности он достиг наивысшего карьерного пика, в советское время возглавлял Госбанк СССР, а после распада Союза — Центральный банк Российской Федерации. Нам этот человек интересен ещё и потому, что корни его здесь, в Беларуси, а точнее — в Климовичском районе. Климовчанами были его дед и отец, называют и других родственников, до сих пор живущих в этих местах.

Итак — Виктор Геращенко о жизни и о многом другом.

* Тут про меня книжка выходила. Тираж быстро раскупили, потом допечатывали. В банковской системе ведь много людей работает, вот каждый, видимо, и сказал себе: «Интересно, а что этот засранец думает?»

* В детстве я мечтал стать юристом, но мой дядька, который работал в Министерстве высшего образования, говорил: «Зачем тебе учиться на юриста? У нас государство справедливое, работы не будет».

* Когда умер Сталин, никто из нас не плакал. Мне кажется, что очереди у его гроба были не данью уважения, а любопытством. Желали убедиться, что он действительно умер.

* Почему Андропов выбрал Горбачева, я до сих пор понять не могу. Мужик-то недалёкий, болтун.



* Как-то бывшего шефа Штази спросили про Путина, который только-только стал премьером: «Вы его знали лично?» — «Нет, — говорит, — не знал». — «А ему ведь у вас медаль дали — за заслуги перед госбезопасностью». — «Да? Так у нас эту медаль вручали каждой уборщице, которая больше 20 лет проработала».

* Четыре первых года Путин вообще ничего не делал. Ельцин оставил ему Касьянова, сел на президентскую машину и уехал. Мы тогда из банка Путину выделили машину — пока он не купил «мерседес». Но странно это. Неужели, он не мог сказать Ельцину: оставь машину?

* В прошлом году за границу вывели 84 миллиардов долларов, и всем наплевать. Потому что люди, которые отвечают за экономику, ни хрена в ней не понимают.

* Хотел бы, чтобы мои правнуки жили в государстве, где во власти нормальные люди, которые понимают, что они делают. Где таких взять? Они должны хотя бы происходить не из одного города и не из одного двора.

* Однажды сотрудник ГАИ меня останавливает и спрашивает: «Виктор Владимирович, во что деньги перевести — в евро или доллары?» Я говорю: «А ты сколько вчера набрал?» Он смеётся и отпускает.

* Я доволен тем, как сложилась моя жизнь.

* ДОСЬЕ «КЛІМАВІЦКАЙ ІНФА-ПАНАРАМЫ»:

ГЕРАЩЕНКО Виктор Владимирович (род. 21 декабря 1937, Ленинград), российский финансист, банкир, профессор. В 1960-1989 гг. работал в системе Внешторгбанка СССР. Возглавлял совзагранбанки и их отделения в Лондоне, Бейруте, Франкфурте-на-Майне, Сингапуре. В 1985-1989 гг. — первый зампред правления Внешторгбанка СССР. С 1989 председатель правления Государственного банка СССР. В 1992-1994 гг. председатель правления Центрального банка России. В 1996-1998 гг. председатель правления Международного Московского банка. После дефолта в 1998 году, вновь назначен главой Центрального банка РФ. На этом посту проработал до середины марта 2002. В 2004-2007 председатель совета директоров компании «ЮКОС». В некотором роде является нашим земляком. Его дед жил и умер в Климовичском районе. Отец – Владимир Сергеевич Геращенко – родился в июле 1905 года в Климовичах и до 1923 г. жил на Климовщине, трудился регистратором уездного продовольственного комитета и счетоводом заготовительной конторы. Потом уехал в Ленинград, стал учёным-экономистом, был первым заместителем Председателя Правления Госбанка СССР. Сам Виктор Геращенко никогда не был на Родине отца, хотя здесь до сих пор живут их родственники. Один раз в 2001 г., будучи на официальной встрече в Могилёве, высказал намерение заехать в Климовичи, увидеть могилу деда, но не смог. В семье двое детей, четверо внуков, один правнук.

РУП ПРЕОБРАЗОВАНО В ОАО

Тимур НЕЗВАНОВ

В конце января Информационное агентство «ЭКОПРЕСС» распространило новость, что

республиканское унитарное предприятие «Климовичский ликеро-водочный завод» преобразовано в открытое акционерное общество «Климовичский ликеро-водочный завод».

Как сообщили ЭКОПРЕСС в пресс-службе Белгоспищепрома, преобразование произошло в соответствии с планом преобразования республиканских унитарных предприятий в открытые акционерные общества на 2011-2013 годы, утвержденным постановлением Совмина № 348 от 21 марта 2011 года, приказом Госкомимущества № 308 от 30 декабря 2013 года.

Государственная регистрация ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод» осуществлена 23 января 2014 года.



ВЫГОНЯТЬ ИЗ АРЕНДНОЙ КВАРТИРЫ ПОСЛЕ СМЕРТИ НАНИМАТЕЛЯ НЕ БУДУТ

После смерти или выезда нанимателя арендного жилья члены его семьи не лишатся права на проживание в нём, если надлежащим образом исполняют обязанности по договору, сообщила начальник отдела юридической работы и кадров Министерства ЖКХ Наталья Кухарчик. Более подробно об этом можно было узнать на сайте gazetaby.com

— В Жилищном кодексе предусматривается переоформление договора найма. Допустим, если с нанимателем что-либо случилось или он выехал из этого жилого помещения, то члены его семьи, которые проживают в этой квартире, смогут перезаключить договор найма на тех же условиях и останутся проживать в этой квартире, – проинформировала Н.Кухарчик во время онлайн-конференции на сайте БЕЛТА.

— Никто никого выгонять не будет, если эти граждане надлежащим образом исполняют обязанности по договору, то есть исправно платят, нет задолженностей за жилищно-коммунальные услуги, нет фактов административных правонарушений, они не нарушают правил пользования жилищным помещением, – добавила она.

Специалист отметила, что существует разница между получением арендного жилья и получением квартиры в собственность.

— В указе N563 сказано: если граждане надлежащим образом исполняют свои обязанности нанимателя, то с ними обязаны продлить договор на срок до 5 лет. Этот договор может стать бесконечным и пожизненным, – уточнила представитель Минжилкомхоза, отмечает interfax.by.

Указ президента Беларуси от 16 декабря 2013 года N563 «О некоторых вопросах правового регулирования жилищных отношений» предполагает формирование фонда жилых помещений коммерческого использования (арендное жилье) путём перевода государственного жилья в арендное. Жилые помещения государственного жилищного фонда, не приватизированные гражданами, будут переведены в коммерческое жилье после 1 июля 2016 года. До этой даты граждане смогут воспользоваться правом на приватизацию. После названной даты приватизация прекращается.

ПОСЛЕ ВЫБОРОВ СТРОИТЕЛЬСТВО ЖИЛЬЯ В КЛИМОВИЧАХ СОКРАТИЛОСЬ В ЧЕТЫРЕ РАЗА

Данила МЕСТИЧ

В 2010 году перед президентскими выборами Александр Лукашенко щедрой рукой раздавал многочисленные обещания. Что сбылось из этих посулов, удалось ли что-нибудь выполнить? Одним из самых больших разочарований и для самого Лукашенко, и для его избирателей стал провал президентской программы строительства жилья. Это событие самым наглядным образом показало, что белорусское экономическое чудо закончилось и, судя по всему, навсегда.

Обратимся к официальным материалам. В прошлом году Комитет государственного контроля совместно с областным статистическим Управлением организовал проверки работы строительных организаций Могилёвской области. В результате были выявлены многочисленные факты искажения статистической отчётности. Как информировал КГК, по результатам проверок из госстатотчётности за первое полугодие 2013 г. исключено почти 60 тыс. кв. м. жилья. Это почти 25% от общей площади жилья, которое оказалось введённым в строй только в отчётах на бумаге.

В свою очередь, строительные организации указывают на недостаток финансирования, что не позволяет им проводить работы в прежнем объёме. Например, в Климовичском районе финансовые средства, направляемые на жилищное строительство, с каждым годом становятся всё меньше: в 2010 году — 31,3 млрд. руб., в 2011 — 29,2 млрд., в 2012 — 18,7 млрд. В итоге объёмы вводимого в строй жилья сократились буквально в несколько раз! Если в 2010-м, в год президентских выборов, в Климовичском районе ввели в эксплуатацию 20,2 тыс. кв. м. жилой площади, то в 2011 — 15,3 тыс., в 2012 — 6,1 тыс., а в 2013 — и вовсе лишь 4,9 тыс.

То ли у президента обещания кончились, то ли их берегут до следующих выборов…

НА МОГИЛЁВЩИНЕ ПОЯВИТСЯ ЕЩЁ ОДИН ФОК

Климовичи опять пролетели, так как строить будут в Костюковичах

Тимур НЕЗВАНОВ

Уже мало кто верит, что в Климовичах всё-таки станут заниматься строительством физкультурно-оздоровительного комплекса. Всем уже ясно, что сегодня государство не может позволить себе такие значительные расходы. Но почему тогда в госбюджете находятся деньги на аналогичные строительные проекты для других районов?

Осенью прошлого года официально сообщили, что строительство физкультурно-оздоровительного комплекса начинается не где-нибудь, а в Краснополье. Объявлено, что там будет игровой зал с трибунами, бассейн, баня, тренажёрный зал и другие помещения. Обещается, что ФОК будет сдан к Новому 2015 году.

А в этом январе СМИ дружно объявили, что одним из значимых объектов областной инвестиционной программы станет Костюковичский физкультурно-оздоровительный комплекс. Финансирование осуществляется из республиканского и областного бюджетов. ФОК порадует посетителей 25-метровым бассейном с пятью плавательными дорожками, сауной, тренажёрным залом, секцией для занятий боксом и др. Построить его намечено до завершения 2014 года.

Трудно поверить, что у Краснополья и Костюковичей больше финансовых возможностей. Видимо, местные власти там более пробивные, чем в нашем районе.

ГЕНАДЗЬ ГРУШАВЫ: ГЕНЕТЫЧНЫЯ НАСТУПСТВЫ ЧАРНОБЫЛЯ З ЧАСАМ ТОЛЬКІ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ

Вольга МІЦКЕВІЧ, Еўрарадыё

У мінулым годзе Еўрарадыё паразмаўляла пра наступствы Чарнобыля з былым дэпутатам Вярхоўнага Савету, кіраўніком фонду "Дзеці Чарнобыля" Генадзем Грушавым.

**** Еўрарадыё***: Пасля катастрофы прайшло 27 гадоў, гэтай трагедыяй мы жылі першыя гады, а цяпер неяк забыліся пра яе. З якімі наступствамі катастрофы мы сутыкаемся сёння?

**** Генадзь Грушавы***: Вядома, 27 гадоў гэта вялікі час, тым не менш Чарнобыль гэта не тая катастрофа, якая праходзіць за гады. Калі навукоўцы ўпершыню сутыкнуліся з гэтай праблемай, яны казалі пра тое, што наступствы будуць адчувальныя яшчэ стагоддзе. Я б назваў тры самыя асноўныя праблемы, з якімі мы сёння сутыкнуліся: па-першае, гэта стан здароўя беларускага народа, ён пагаршаецца, статыстыка адлюстроўвае гэты працэс. Прычым гаворка ідзе не толькі пра анкалагічныя захворванні, але пра больш шырокі спектр. Бо радыяцыя ўплывае на пагаршэнне працы імуннай сістэмы. Найбольш небяспечная рэч — гэта стан здароўя дзяцей, другога, хутка будзе ўжо трэцяга пакалення, тых, хто падчас катастрофы знаходзіўся непасрэдна каля станцыі ці ў тых месцах, куды выпадалі радыяцыйныя ападкі. Ёсць некалькі клінік, я калісьці з імі супрацоўнічаў, і мы вялі статыстыку па захворваннях чарнобыльскіх дзяцей. Дык вось, яны ў разы болей хварэлі, чым іншыя дзеці, самымі рознымі захворваннямі. На жаль, сёння гэтая інфармацыя зноў засакрэчаная. І цяпер гэта асноўная праблема — адсутнасць інфармацыі па стане здароўя насельніцтва.

**** Еўрарадыё***: Ці праз 27 гадоў змяніўся ўплыў радыяцыі? Можа, ён паменшыўся?

**** Генадзь Грушавы***: Калі мы гаворым пра генетычныя наступствы, то яны не могуць паменшыцца, тут трэба казаць пра павелічэнне. Але калі мы кажам пра людзей, якія жывуць на тэрыторыі, дзе кюры было па 5-10, то сапраўды цяпер узровень радыяцыі за апошнія гады знізіўся, але не знік. Гэта распад цэзію — 24 гады, але яшчэ ёсць стронцый, а ён распадаецца 90 гадоў, ёсць плутоній, а гэта 2000 гадоў распаду, ёсць яшчэ болей за 20 радыенуклідаў.

**** Еўрарадыё***: У 2007 годзе адмянілі льготы чарнобыльцам, і ліквідатары таксама сёння ні капейкі не атрымліваюць. Дзяржава прадэманстравала гэтым, што праблемы для яе не існуе, і беларусам няма на каго спадзявацца. У такой сітуацыі як магчыма дапамагаць пацярпелым ад катастрофы? А пацярпелі, можна сказаць, мы ўсім грамадствам, бо працягваем жыць на забруджаных тэрыторыях.

**** Генадзь Грушавы***: Сёння магчымасці дапамагаць пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС вельмі вузкія. Калі раней я займаўся дабрачыннымі праграмамі, мы мелі непасрэдны выхад на гэтых людзей. Мы мелі магчымасць атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю аб стане здароўя, аб іх праблемах на рэгіянальным узроўні: у тых мястэчках і вёсках, дзе яны жывуць. Апошнія 10 гадоў мы не можам ні атрымаць інфармацыю, ні нешта зрабіць для людзей: нас туды проста не пускаюць.

**** Еўрарадыё***: Калі няма ніякай дзяржаўнай палітыкі, можа, варта распрацаваць нейкую грамадскую палітыку ці шэраг грамадскіх кампаній?

**** Генадзь Грушавы***: Вельмі цяжка зарыентавацца, дзе патрэбная дапамога, да якіх канкрэтна людзей трэба дайсці. Першае, што мы рабілі ў 1988 — 1989 гадах, калі мы распачыналі дзейнасць, гэта атрыманне аб'ектыўнай інфармацыі. Цяпер мы сутыкаемся з тым жа, трэба шукаць шляхі для атрымання аб'ектыўнай інфармацыі, інакш адбудаваць наноў сістэму дапамогі грамадству не атрымаецца.



**** Еўрарадыё***: Мы працягваем харчавацца забруджанымі прадуктамі, тэрыторыі ў Гомельскай вобласці выкарыстоўваюцца падворныя землі. Ці можна гэтаму неяк супрацьстаяць?

**** Генадзь Грушавы***: Супрацьстаяць гэтаму магчыма, калі валодаеш інфармацыяй. Сёння насельніцтва не атрымлівае такіх аб'ектыўных звестак па стане забруджанасці і падворных зямель, і прадуктаў. Улада вядзе такую палітыку, згодна з якой беларусы не жывуць, а існуюць, і не задаюцца пытаннем пра забруджанасць тэрыторый і пра забруджанасць прадуктаў, якія спажываюць. Гэта палітыка працягваецца з савецкіх часоў, каб народ менш задаваў пытанняў уладзе. І, канечне, пытанне Чарнобыля — вострае пытанне, якое ўладзе замінае.

**** Еўрарадыё***: Ці выязджаюць цяпер дзеці на аздараўленне па чарнобыльскіх праграмах?

**** Генадзь Грушавы***: Выязджаюць дзеці на аздараўленне за мяжу, але не так масава, як калісьці. Калі на пачатку 90-х гг. мы казалі пра дзясяткі тысяч (40-50 тыс. дзяцей у год), то цяпер ў лепшым выпадку кажам пра сотні. Бо з 1997 года ўлада толькі і рабіла, што стварала розныя перашкоды для такой дзейнасці. Каб гэтая дзейнасць не толькі была пад кантролем дзяржавы, але і цалкам залежала ад яе. Калі грамадскія арганізацыі спрабуюць казаць праўду аб пагрозе радыяцыі, калі яны тлумачаць людзям, дзе дзяржава не дапрацоўвае, то тады дзейнасць недзяржаўных арганізацый дзяржавай нівелюецца. Як у такіх умовах спалучыць грамадскую актыўнасць і эфектыўныя праграмы, якія весці без дзяржавы фактычна немагчыма?



ДРУЖБА ПО УКАЗКЕ СВЕРХУ

Чуть ли не каждый месяц белорусские граждане узнают об укреплении сотрудничества нашей страны то с Китаем, то с Венесуэлой, то с ещё каким-нибудь экзотическим другом и союзником. В Минске появился парк имени Уго Чавеса, в школах открываются классы с китайским языком обучения. Гостеприимная Беларусь широко раскрывает свои объятья…

Но всё это уже было во времена СССР, когда нечто подобное нам рассказывали коммунистические вожди и идеологи. Вот один из красноречивых эпизодов советского прошлого, характеризующий особенности официальной дружбы народов (документ из партийных архивов печатается по публикации в журнале «ИСТОЧНИК» - №2, 1994).

Из письма в Центральный Комитет КПСС

В соответствии с решением ЦК КПСС от 31 июля 1958 г. в 8 союзных республиках, а также в Хабаровском и Приморском краях, Ленинградской и Иркутской областях созданы местные отделения Общества советско-китайской дружбы.

В указанном решении ЦК предусмотрено создание в Бурятской АССР отделения Общества советско-монгольской дружбы. Однако газета «Правда» 26 сентября опубликовала ошибочное сообщение о том, что в Бурятской АССР создаётся отделение Общества советско-китайской дружбы. В связи с этим посол КНР в Москве т. Лю Сяо направил в Улан-Удэ приветственную телеграмму по случаю создания там отделения Общества советско-китайской дружбы.

Учитывая, что китайские друзья уверены в существовании в Бурятии отделения Общества советско-китайской дружбы, Бурятский обком КПСС и Союз советских обществ дружбы и культурной связи с зарубежными странами просят разрешения на создание в Бурятской АССР отделения Общества советско-китайской дружбы.

Считали бы целесообразным разрешить Бурятскому обкому КПСС создать местное отделение Общества советско-китайской дружбы.

Что касается ошибки газеты «Правда», то по сообщению т. Селюка редакция газеты обсудила этот вопрос и на виновника ошибки зав. отделом информации т. Вавилова наложено взыскание.

ДОСКА ОБЪЯВЛЕНИЙ

* Мне 34 года, образование высшее, дочери 8 лет. Буду верна доброму надёжному другу до 40 лет. (Брачное объявление в газете).

* Товарищи отдыхающие, фотограф ждёт вас у входа в пансионат. Кто не сфотографируется, тот уедет от нас без памяти. (Объявление в пансионате).

* Школа 10 лет учила вас жить, теперь жизнь вас вышколит. (Плакат к празднику «Последний звонок»).

* Граждане, обилечивайтесь, а не то будете обезрублены. (Объявление водителя автобуса).

* Одетые мужчины не обслуживаются. (Объявление в столовой).

* По случаю сбора макулатуры мальчики приходят в форменном, а девочки в бесформенном виде. (Объявление в школе).

* Больных в 7 часов утра закапывать всех. (Объявление в глазном отделении больницы).

* «Ешь морковку, лук и хрен, будешь, как Софи Лорен». (Плакат в столовой).

ІНТЭРНЭТ-БІБЛІЯТЭКА KAMUNIKAT.ORG: БОЛЬШ ЗА 13 000 БЕЛАРУСКІХ ВЫДАННЯЎ

Праект “Беларуская інтэрнэт-бібліятэка Kamunikat.org”, які рэалізуе Беларускае гістарычнае таварыства, існуе з 2000 году і арыентаваны на збор незалежных беларускіх выданняў. На сайце www.kamunikat.org можна знайсці кнігі, газеты, аўдыё і відэа. Усяго размешчана больш за 13 000 розных выданняў. А ў раздзеле “Перыёдыка” знаходзяцца ўсе нумары “Клімавіцкай Інфа-Панарамы” за 2012 і 2013 год.



kamunikat

Беларуская Інтэрнэт–Бібліятэка

А ВАМ ЛЕНИН МЕШАЕТ?

21 января 1924 года, то есть 90 лет назад, умер Владимир Ленин, тело которого до сих пор находится в Мавзолее на Красной площади. Журнал «Коммерсантъ Власть» спросил у известных россиян — а вам Ленин мешает?


Михаил Ефремов, заслуженный артист России, так ответил на этот вопрос:

«Наверное, нет. Я читал о нём в рамках курса истории, и сейчас понимаю: его идеи и привели к такому варварскому руководству страной, именно из-за него мы живём сейчас так, как живём. И пусть власть с ним делает что хочет, мне всё равно. Если был бы референдум, я бы голосовал за захоронение. Ну сколько можно? Не «дедушку мучить» — мучить его можно было бы и дольше, а сколько можно самим быть как туземцы со стеклянными бусами? Надо становиться цивилизованным обществом, навсегда забыв бредовые идеи».

ПАПА РИМСКИЙ НАЗВАЛ ИНТЕРНЕТ БОЖЬИМ ДАРОМ

Папа Римский Франциск заявил, что интернет — это божий дар, который помогает облегчить диалог между людьми, хотя и создает иногда препятствия для живого общения. Об этом сообщает Associated Press.

«Это по-настоящему нужная вещь, божий дар. Тем не менее желание постоянно быть в сети может повлечь за собой изоляцию от близких нам людей. Живое общение в эру цифровых технологий — это как облегчающий боль бальзам и веселящее сердце хорошее вино», — сказал папа Римский. Он считает, что интернет даёт возможность встретить людей, которые принадлежат к различным культурам, и найти с ними общий язык.



КЛІМАВІЦКАЯ ІНФА-ПАНАРАМА

Клімавіцкі грамадска-палітычны бюлетэнь
Адказны за выпуск: Аржанцаў Сяргей Юр'евіч
Адрас: Клімавічы, вул. Леніна, д. 27а, кв.15.
Надрукавана на ўласным абсталяванні. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюджваецца бясплатна